## Секция 11

# ПРАВО И ЭКОНОМИКА: ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕННЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

**_А. Д. Воінава_**
_Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В. М. Лянцэвіч_
_БДЭУ (Мінск)_

## ДА ПЫТАННЯ АБ ТЭРМІНЕ «КАРУПЦЫЯ»

Даследчыкі ў галіне вывучэння тэорыі паходжання дзяржавы і права распрацоўваюць розныя падыходы да разумення тэрміна «карупцыя». Можна вылучыць дзве асноўныя пазіцыі: у так званым вузкім разуменні карупцыя вызначаецца як подкуп, хабарніцтва, прадажнасць службовых асоб; у шырокім сэнсе — карыслівае злоўжыванне сваім службовым становішчам.

А. І. Далгова вызначае карупцыю як «социальное явление, характеризующееся подкупом-продажностью государственных и иных служащих и на этой основе корыстным использованием ими в личных либо узкогрупповых, корпоративных интересах официальных служебных полномочий, связанных с ними авторитета и возможностей» [1, с. 23]. В. В. Барыс лічыць, што з дадзенага вызначэння варта поўнасцю выключыць прыкмету «прадажнасці», паколькі гэта не мае дачынення да справы. Прадажнасць — гэта карыслівая рыса характару, а не злачынства [2, с. 111].

Адзначым аргументацыю Н. А. Лапашэнкі, якая прыводзіць зусім адрозны пункт гледжання аб вузкім падыходзе да вызначэння тэрміна. «Подкуп является стержнем коррупции, ... . Злоупотребления должностных лиц и иных служащих, …, не могут расцениваться как коррупционные» [3, с. 99]. Даследчык, характарызуючы карупцыю, акцэнтуе ўвагу на подкупе.

Напрыканцы адзначым пазіцыю А. Р. Карчагіна і А. М. Іванова ў стаўленні да вузкага падыходу. На думку даследчыкаў, механізм карупцыі прадугледжвае два варыянты карумпаваных паводзін, сутнасць аднаго з якіх складае ўзаемадзеянне

двух зацікаўленых суб'ектаў, у іншым жа выпадку — карупцыйная дзейнасць зводзіцца толькі да цікавасці з аднаго боку [4, с. 113].

Калі перайсці да вызначэння шырокага падыходу, Н. Ф. Кузняцова не згодна з тым, каб усю сістэму карыслівых службовых злачынстваў назваць карупцыяй, бо гэта нязгодна з прынцыпам дыферэнцыяцыі віны, адказнасці і пакарання [5, с. 22–23]. В. В. Барыс падтрымлівае меркаванне Кузняцовай, бо бачыць магчымае з'яўленне блытаніны ў кваліфікацыі пры ўвядзенні агульнага паняцця карупцыйных злачынстваў [2, с. 112].

Шырокае разуменне карупцыі адлюстроўвае крымінолаг В. В. Лунееў, які тлумачыць, што «...коррупция не сводится к примитивному взяточничеству, … . Лоббизм, фаворитизм, протекционизм, взносы на политические цели, традиции перехода политических лидеров и государственных чиновников на должности почетных президентов корпораций и частных фирм, … и так далее являются завуалированными формами коррупции» [6, с. 131–132]. Аднак мы лічым, што лабізм, унёскі на палітычныя мэты, шэраг іншых дзеянняў могуць ажыццяўляцца на карысць грамадства на законных падставах.

З нашага пункту гледжання, карупцыйнымі можна назваць толькі тыя злачынствы, якія адрозніваюцца карыслівымі матывамі, злоўжываннем службовымі паўнамоцтвамі. Абавязковай прыкметай павінна быць дамоўленасць паміж асобай, якая валодае ўладнымі паўнамоцтвамі, і асобай, якая жадае атрымаць пэўныя выгады, якія для яго ажыццяўляе службовая асоба за некаторую ўзнагароду.

## **Крыніцы**


1. Преступность и власть : материалы конф., Москва, 1–3 марта 2000 г. / редкол. А. И. Долгова [и др.]. — М. : Рос. криминол. ассоц., 2000. — 83 с.

2. *Барис, В. В.* Определение коррупции с политологической и государственно-правовой точек зрения / В. В. Барис, Ю. О. Народицкий // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 18. Социология и политология. — 2009. — № 1. — С. 109–119.

3. *Лопашенко, Н. А.* Коррупция: содержание, проблемы правовой регламентации / Н. А. Лопашенко // Уголов. право. — 2001. — № 2. — С. 98–102.

4. *Корчагин, А. Г.* Сравнительное исследование коррупционных и служебных преступлений : монография / А. Г. Корчагин, А. М. Иванов. — Владивосток : Изд-во Дальневост. ун-та, 2001. — 228 с.

5. *Кузнецова, Н. Ф.* Коррупция в системе уголовных преступлений / Н. Ф. Кузнецова // Вестн. Моск. гос. ун-та. Сер. 11. — 1993. — № 1. — С. 21–26.

6. *Лунеев, В. В.* Преступность XX века: мировые, региональные и российские тенденции / В. В. Лунеев. — 2–е изд., перераб. и доп. — М. : Волтерс Клувер, 2005. — 912 с.